Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
21 ЛІПЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 136 (27994) Кошт 2300 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Уверх па лесвіцы — да ўнікальных фондаў**

СТАР. 9

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Дзесяць мяхоў бульбы на дранікі**



**Каларыт ерэванскага кінафестывалю**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ігар ГРЭЙБА, начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генеральнай пракуратуры:**

*«Нормы закона «Аб барацьбе з карупцыяй», падпісанага Прэзідэнтам, акажуць істотны ўплыў на прафілактыку карупцыйных правапарушэнняў, знізяць рызыкі здзяйснення падобных злачынстваў, будуць спрыяць абароне эканамічных інтарэсаў грамадства і дзяржавы. Закон таксама дасць дадатковыя магчымасці праваахоўнікам спыняць карупцыйныя правапарушэнні. У дакуменце знайшлі сваё месца нормы, якія раней не былі прадугледжаны заканадаўствам».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15182,00 | ▼ |
| Еўра | 16448,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 266,78 | ▼ |
| Укр. грыўня | 686,97 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Урокі радасці



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Выбары-2015

# ПРАВА ЗБОРУ ПОДПІСАЎ

## З 15 ініцыятыўных груп, якія падалі заявы ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэферэндумаў, зарэгістравана восем

**Гэта групы, якія будуць збіраць подпісы па вылучэнні ў кандыдаты Аляксандра Лукашэнкі, Сяргея Калякіна, Сяргея Гайдукевіча, Таццяны Караткевіч, Анатоля Лябедзькі, Віктара Цярэшчанкі, Жанны Раманоўскай і Мікалая Улаховіча.**

Учора на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў было разгледжана 12 заяў. Адмоўлена ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп сямі прэтэндэнтам: Андрэю Канаўцу, Мікалаю Статкевічу, Ірыне Першынай, Сяргею Заблоцкаму, Тамары Біруковай, Аляксандру Юдаеву і Віктару Талмачову. Падставамі для адмовы сталі неадпаведнасць патрабаванням спосабаў, зместу, формы і тэрмінаў падачы дакументаў, а таксама, у выпадку з Мікалаем Статкевічам, — прамая забарона на ўдзел у выбарах у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь асобы, якая мае судзімасць.

— Думаю, група Статкевіча цудоўна разумее, што ніякіх юрыдычных прэтэнзій з іх боку няма і быць не можа, — пракаментаваў адмову ў гэтай сітуацыі **сакратар Цэнтральнай камісіі Мікалай ЛАЗАВІК.** — Яны ведаюць, што мы паступілі ў поўнай адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам.

Віктар Талмачоў падаў дакументы на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы 20 ліпеня, праз тры дні пасля заканчэння прадугледжанага для гэтага тэрміну. Пазней за вызначаную законам дату данеслі неабходныя для рэгістрацыі групы (або выпраўленыя) дакументы Аляксандр Юдаеў і Тамара Бірукова. Аднак ні спасылкі на «форс-мажорныя» прычыны спазнення (завіс камп'ютар), ні довады пра тое, што інфармацыя пра тэрміны не была агучана досыць шырока, ні просьба пайсці насустрач з-за таго, што тэхнічныя памылкі дапушчаны ўсяго толькі ў некалькіх імёнах або прозвішчах, не змянілі цвёрдай пазіцыі ЦВК: дакладна трымацца літары закону.

— Справа ў тым, што некаторыя ініцыятыўныя групы па колькасці нават не дацягвалі да 100 чалавек, што прадугледжваецца Выбарчым кодэксам, а гэта значыць, што чалавек не мае рэальнай сацыяльнай падтрымкі ў грамадстве, яго можна назваць самавылучэнцам, — разважаў пра тыповыя прычыны няўдач на гэтым этапе Мікалай Лазавік. — Другая памылка ў тым, што людзі, якія жадаюць быць вылучанымі ў кандыдаты на такую высокую пасаду, задумваюцца пра тое, што яны хацелі б кіраваць дзяржавай, літаральна за тыдзень-паўтара да заканчэння тэрміну падачы заявы. Пра гэта трэба думаць усё жыццё. Напэўна, чалавек, які дбае пра сваю Айчыну, стараецца праявіць сябе не толькі на самай высокай пасадзе, але і на пасадзе больш сціплай, ён імкнецца зрабіць карысць для дзяржавы, дабіцца прасоўвання свайго праекта, зрабіць нешта добрае для людзей, каб яны пра яго даведаліся, а потым, абапіраючыся на падтрымку гэтых людзей, вылучаецца на больш высокую пасаду. І неабавязкова адразу ў прэзідэнты, можна дэпутатам раённага, абласнога Савета, Палаты прадстаўнікоў. А калі ўжо сапраўды зарэкамендаваў сябе як дзяржаўны дзеяч, тады можна і на самую высокую пасаду прэтэндаваць.

### «ФРЫКІ» БЫЛІ ЗАЎСЁДЫ

Журналісты, уражаныя экзальтаванасцю некаторых прэтэндэнтаў, спыталі сакратара ЦВК, ці не лічыць ён, што патэнцыйны кандыдат павінен прыносіць даведку ад урача аб псіхічным здароўі.

— Наша заканадаўства прадугледжвае, што ў выбарах не ўдзельнічаюць асобы, пазбаўленыя судом дзеяздольнасці. Аднак падчас усіх выбарчых кампаній з'яўляюцца людзі, якія вырашаюць або свае асабістыя праблемы (напрыклад, нейкія юрыдычныя пытанні), або проста жадаюць прыцягнуць да сябе ўвагу — папіярыцца. Напрыклад, артыст або прадпрымальнік. Я не бачу ў гэтым нічога ганебнага. Фрыкі (ад англ. friok — «вычварны, дзіўны». — **Рэд.**) былі заўсёды, усюды, і, напэўна, яны будуць, — адказаў Мікалай Лазавік.

СТАР. 2